**Вяртанне кошту праезду пры часовым спыненні руху цягнікоў**

У выпадку часовага спынення руху цягнікоў і адмовы ад паездкі пасажыру, які аплаціў праезд жэтонам або праязным білетам на колькасць паездак і прайшоў на станцыю праз лінію кантролю, у касе (па яго патрабаванні) выдаецца таварны чэк для ажыццяўлення другой паездкі.

Яе можна ажыццявіць, прад'явіўшы таварны чэк, на любой станцыі Мінскага метрапалітэна ў зручны для пасажыра час.

Пры ажыццяўленні такой паездкі таварны чэк прад'яўляецца кантралёру аўтаматычных прапускных пунктаў і пасля праходу праз лінію кантролю забіраецца.